ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 21 (1133) ● Чацвер, 3 чэрвеня. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

## СУСТРЭЧА Ў БДУ

Учора ў галоўным корпусе БДУ імя У. І. Леніна адбылася сустрэча выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта з членамі ўкраінскай дэлегацыі на дэкадзе літаратуры і мастацтва УССР у Беларускай ССР. Прысутныя цёпла сустрэлі загадчыка аддзела культуры ЦК КПУ М. Р. Ішчанку, міністра культуры УССР А. К. Рамаўскага, двойчы Героя Савецкага Саюза А. К. Нядбайлу, акадэміка-сакратара АН УССР А. Я. Усікава, Героя Савецкага Саюза пісьменніка Ю. А. Збанацкага, намесніка старшыні выканкома Кіеўскага гарсавета Г. М. Мянжэрас. Гасцей горача віталі член-карэспандэнт АН БССР рэктар БДУ прафесар У. М. Сікорскі, сакратар парткома ўніверсітэта Т. Я. Дударава і іншыя прадстаўнікі ўніверсітэта.

На сустрэчы прысутнічалі намеснік старшыні Савета Міністраў БССР Н. Л. Сняжкова, сакратар Мінскага гаркома партыі Т. Ц. Дзмітрыева, сакратар Кастрычніцкага райкома КПБ Н. В. Фокіна.

# НІВОДНАГА АДСТАЮЧАГА ПОБАЧ!

### УМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА І ПАДВЯДЗЕННЯ ЯГО ВЫНІКАЎ У КАМСАМОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯХ АКАДЭМІЧНЫХ ГРУП БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

XVII з'езд ВЛКСМ і XXV з'езд ЛКСМ Беларусі вызначылі задачы па дасканаленню дзейнасці камсамольскіх арганізацый навучальных устаноў у святле пастаноў ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР па вышэйшай школе, выступленняў Л. І. Брэжнева на Усесаюзным злёце студэнтаў і XVII з'ездзе ВЛКСМ.

Значныя перспектывы, якія адкрыў перад усім савецкім народам XXV з'езд КПСС, ставяць і перад студэнтамі БДУ імя У. І. Леніна новыя задачы, у рашэнні якіх мы павінны зыходзіць з дасягнутага: 1389 студэнтаў-камсамольцаў універсітэта вучацца на «выдатна», 4314 — на «выдатна» і «добра». Але разам з тым відавочна, што камсамольская арганізацыя ўніверсітэта мае яшчэ значныя рэзервы і магчымасці для павышэння паспяховасці. У дзесятай пяцігодцы мы павінны дабіцца таго, каб кожны камсамолец пастаянна паглыбляў свае веды, выпрацоўваў даследчыцкія навыкі, пашыраў палітычны кругагляд.

У першую чаргу трэба зрабіць так, каб у кожнай групе было створана становішча ўзаемадапамогі, таварыскай непрымірымасці да праяўленняў нядобрасумленнасці. Камсамольская прынцыповасць не можа быць побач з фармалізмам і няякаснасцю ведаў.

У сувязі з гэтым ва універсітэце разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва акадэмічных груп пад лозунгам «Ніводнага адстаючага побач!».

**І. Умовы правядзення агляду-конкурсу:**

Лепшая акадэмічная група вызначаецца па наступных паказчыках:

1. Паспяховасць студэнтаў —

а) абсалютная паспяховасць студэнтаў вызначаецца адносінамі колькасці студэнтаў, якія здалі сесію, да агульнай колькасці студэнтаў, якія павінны былі здаваць сесію;

б) **асаблівая ўвага ўдзяляецца якаснай паспяховасці студэнтаў**, якая вызначаецца адносінамі агульнай колькасці студэнтаў, якія здалі ўсе экзамены на «добра» і «выдатна», да агульнай колькасці студэнтаў, якія здавалі сесію.

**Група, паспяховасць якой на працягу новага семестра не павысілася (калі ў групе няма здавальняючых адзнак, то суадносяцца выдатныя і добрыя), у наступным этапе конкурсу не зможа зноў заняць прызавое месца.**

З мэтай павышэння якасці вучобы ў групах 1—2 разы на працягу семестра рэкамендуецца праводзіць агляды бягучай паспяховасці, якія праследуюць наступныя мэты і задачы:

— павышэнне бягучай паспяховасці студэнцкіх груп на аснове персанальнай ацэнкі работы кожнага студэнта групы за пэўны перыяд;

— аналіз прычын адставання ад вучэбнага графіка асобных студэнтаў групы і вызначэнне канкрэтных мер дапамогі і грамадскага ўздзеяння з боку калектыву групы;

— здзяйсненне калектыўнага кантролю за выкананнем рашэнняў камсамольскіх сходаў па вучэбных пытаннях;

— распрацоўка канкрэтных мерапрыемстваў для паляпшэння падрыхтоўкі групы да кантрольных работ на працягу семестра;

— правядзенне параўнальнага аналізу бягучай паспяховасці студэнтаў групы з паспяховасцю курса (патока).

**2. Адным з важнейшых паказчыкаў вучэбна-выхаваўчай работы групы з'яўляецца работа з адстаючымі. Арганізацыя пастоў узаемадапамогі, індывідуальная работа з адстаючымі; прыцягненне выдатнікаў да гэтай работы. Камсамольскаму бюро групы неабходна ўстанавіць індывідуальны кантроль за работай кожнага студэнта, які займаецца на «здавальняюча» і ніжэй.** Пры падвядзенні вынікаў асобна разглядаць вучобу адстаючых.

3. Удзел студэнтаў у навуковай рабоце.

4. Якасць навуковых работ студэнтаў.

5. Удзел студэнтаў у конкурсе работ па грамадскіх дысцыплінах.

6. Якасць навуковых работ па грамадскіх навуках.

7. Атэстацыя па грамадска-палітычнай практыцы студэнтаў.

8. Удзел студэнтаў у грамадскім жыцці.

9. Трэці працоўны семестр.

10. Заняткі фізкультурай і спортам.

11. Узровень дысцыпліны:

а) колькасць прапушчаных гадзін па няўважлівай прычыне;

б) колькасць спагнанняў, якія вынес дэканат, рэктарат і камітэт камсамола студэнтам;

в) колькасць заахвочванняў.

Камітэтам камсамола факультэтаў, бюро камсамольскіх арганізацый і камсамольскіх груп распрацаваць на кожны семестр канкрэтныя мерапрыемствы сацыялістычнага спаборніцтва.

**ІІ. Парадак правядзення конкурсу**

Вынікі падводзяцца камітэтам камсамола ўніверсітэта 2 разы ў год (пасля сесій).

На факультэтах рэкамендуецца падводзіць папярэднія вынікі (па трох першых і апошняму паказчыку) 2 разы ў семестр. **Усебакова асвятляць вопыт работы лепшых студэнцкіх калектываў, ленінскіх і імянных стыпендыятаў, выдатнікаў вучобы.** У гэтых мэтах шырока выкарыстоўваць шматтыражную газету «Беларускі ўніверсітэт», насценгазеты факультэтаў, курсаў, бюлетэні ВВК факультэтаў, выпускі «маланак» і «экранаў» бягучай паспяховасці.

Перадавы вопыт арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы, вучобы студэнтаў асвятляць шляхам публікацый:

— матэрыялаў, прысвечаных падрыхтоўцы студэнтаў груп да прадстаячых экзаменаў, усебаковаму аналізу вынікаў экзаменацыйных сесій;

— заметак сакратароў камсамольскіх арганізацый, старастаў лепшых груп аб пастаноўцы вучэбна-выхаваўчай работы ў групе, аб выдатніках вучобы, ленінскіх і імянных стыпендыятах, пераможцах конкурсаў;

— артыкулаў членаў ВВК, курсавых бюро аб ходзе спаборніцтваў груп, выніках грамадскіх аглядаў паспяховасці, рэйдаў па праверцы наведвання заняткаў.

Пры падвядзенні вынікаў улічваць і гэты напрамак работы.

**ІІІ. Меры заахвочвання:**

1. Фатаграфаванне лепшых груп на фоне сцяга камсамольскай арганізацыі БДУ (на стэнд «Імянныя стыпендыяты і лепшыя акадэмічныя групы»).

2. Вымпел лепшай групе «Акадэмічная група — пераможца сацспаборніцтва «Ніводнага адстаючага побач!».

3. Узнагароджанне лепшых студэнтаў граматай камітэта камсамола ўніверсітэта.

4. Занясенне ў Кнігу гонару камітэта камсамола.









## ФОТАХРОНІКА ПРАЦОЎНЫХ БУДНЯЎ

**Летам гэтага года байцы будатрада імя Ленінскага камсамола будуць працаваць на БАМе. Атрад сфарміраван на базе гістарычнага факультэта. У яго састаў залічаны лепшыя байцы СБА універсітэта, за плячыма ў якіх не адзін працоўны семестр. Ганаровым байцом атрада з'яўляецца Герой Савецкага Саюза Мікалай Гастэла.**

**Па-ўдарнаму папрацавалі байцы атрада ў падрыхтоўчым перыядзе: праведзена некальні працоўных дэсантаў, шмат зроблена ў плане палітыка-выхаваўчай работы.**

**НА ЗДЫМКАХ:**

**Ганаровая варта ля помніка Герою Савецкага Саюза М. Гастэлу; удзельнікі атраднай групы «Доўг» на сустрэчы з ветэранам Вялікай Айчыннай вайны; баец зімовага СБА імя XXV з'езда КПСС М. Казейка; працоўны дэсант на тэрыторыі Мінскага радыёзавода.**

# УНЕСЦІ ДАСТОЙНЫ ЎКЛАД

**Непрыкметна ляціць за вучобай час. Надышло і жаданае лета, якое для многіх студэнтаў стане чарговым экзаменам на сталасць.**

**На адным з пасяджэнняў камітэт камсамола БДУ вырашаў пытанне аб удзеле студэнтаў у трэцім працоўным семестры, зацвердзіў за атрадамі камандзіраў і камісараў.**

**Мы наведалі універсітэцкі штаб працоўных спраў, сустрэліся з яго камісарам, студэнтам II курса юрыдычнага факультэта Віктарам Галаванавым і папрасілі падрабязна расказаць пра планы будатрадаўцаў.**

**Віктар ГАЛАВАНАЎ:**

— Камсамольская арганізацыя універсітэта заўсёды вылучалася нястомнасцю, паспяховым выкананнем адказнай задачы па падрыхтоўцы, камплектаванню і стварэнню будаўнічых атрадаў.

Сёлета некалькі змяніўся састаў нашых СБА. Раней камплектаваць атрады мы пачыналі дзесьці незадоўга да выезду, што прыводзіла да паспешлівасці ў рабоце. У гэтым годзе падрыхтоўка да трэцяга працоўнага пачалася яшчэ зімой. А да гэтага, восенню, мы правялі падбор кандыдатур будучых камандзіраў і камісараў. Сістэматычна дзейнічала школа, у якой слухачы пазнаёміліся з асноўнымі пытаннямі па арганізацыі вытворчай дзейнасці і ахове працы, з тэхнікай бяспекі ў СБА.

За аснову ўсіх атрадаў браліся вучэбныя групы, што дапамагло СБА аб'ядноўвацца ў адно цэлае задоўга да высадкі працоўнага дэсанта. Тым, каму выпаў гонар быць залічаным у атрад, дазволена датэрміновая здача залікаў і экзаменаў.

Прыемна адзначыць і тое, што адзін з атрадаў рэспублікі — гэта наш СБА «Аэліта» імя Ленінскага камсамола — паедзе працаваць на БАМ. Большасць байцоў атрада маюць за плячыма не адзін працоўны семестр.

Атрад імя К. Заслонава запрошаны саўгасам «Стара-Барысаў». Збудаваны студэнтамі ў мінулае лета аўтагараж на 30 машын атрымаў вышэйшую ацэнку ў дырэкцыі саўгаса. Сёлета будатрадаўцы пабудуюць для саўгаса банна-пральны камбінат і жылы двухкватэрны дом. З павагай называюць рабяты Сашу Чарнушына, Жэню Іванова, Сашу Верамецьева, Грышу Тамільчыка сваімі працоўнымі маякамі.

Адным з лепшых атрадаў БДУ прызнаны атрад «Вікторыя» гістарычнага факультэта. За выключную працавітасць «віктораўцы» былі ўзнагароджаны пераходным Чырвоным сцягам. Сёлета атрад едзе ва Уральскую вобласць.

З нецярплівасцю чакаюць студэнтаў універсітэта ў Комі АССР, Уральскай і Гомельскай, Смаленскай і Пскоўскай абласцях, у Малдавіі і Якуціі.

Зусім нядаўна СБА «Буравеснік» імя Героя Савецкага Саюза В. І. Казлова звярнуўся да ўсіх атрадаў універсітэта з заклікам унесці дастойны ўклад у выкананне новага пяцігадовага плана, працаваць пад дэвізам «Пяцігодку — у чатыры гады, пяцідзёнку — за чатыры дні!». Гэты заклік падтрымалі выключна ўсе нашы атрады.

**М. АНДРЭЕЎ,**
**М. БАЖКО.**

✦ НАШЫ ВЫПУСКНІКІ ✦

# УРОКІ ПАТРЫЯТЫЗМУ

ЧАТЫРНАЦЦАЦЬ год працуе ў нашай школе выпускніца геаграфічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта Людміла Сцяпанаўна Карнейчык. І кожны год яна, класны кіраўнік, ходзіць са сваімі рабятамі ў паход па роднаму краю. Яны пабывалі на месцах баявых дзеянняў атрада чырвоных партызан Дукоры, ў вёсцы Клінок — на месцы памятнага бою партызанскага атрада «Беларусь» Героя Савецкага Саюза Н. П. Пакроўскага, які разграміў у першыя месяцы фашысцкай акупацыі атрад карнікаў.

Былі школьнікі і ў Тальцы, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны дзейнічала камсамольскае падполле на чале з былым выкладчыкам БДУ Іванам Іванавічам Пятроўскім. Там жа грамілі ворага партызаны пухавіцкай брыгады «Полымя» Героя Савецкага Саюза Я. Ф. Філіпскіх. Успамінаючы праведзеныя паходы, Людміла Сцяпанаўна гаворыць:

— Нярэдка рабяты рвуцца ісці ў далёкія месцы, а самі добра не ведаюць свайго раёна. Я лічу, што трэба перш за ўсё вывучыць свой раён — маленькую часцінку вялікай Радзімы.

Пабывала Людміла Сцяпанаўна з юнымі следапытамі ў калгасе «Сцяг камунізму» ў Турыне, на будаўніцтве буйнага торфапрадпрыемства «Сяргеевіцкае» ў Русаковічах, на старэйшым прадпрыемстве раёна — кардоннай фабрыцы ў пасёлку Светлабор. Былі школьнікі са сваёй выкладчыцай у Мінску, Чэрвені, Нясвіжы і радзе іншых гарадоў вобласці і рэспублікі. Пабывалі яны і ў Ленінградзе.

Паходы і экскурсіі сталі для рабят урокамі жыцця, сапраўднымі ўрокамі патрыятызму. Яны ўбачылі, пачулі многае з таго, чаго не знойдзеш ні ў адным падручніку гісторыі і геаграфіі. Поспехі паходаў, якія праводзіла Л. С. Карнейчык, тлумачацца тым, што да іх падрыхтоўкі і правядзення яна адносіцца з пачуццём высокай педагагічнай адказнасці, ставіць выразныя, канкрэтныя выхаваўчыя задачы. Кожны ўдзельнік паходу мае сваё пошукавае заданне, сшытак для запісаў. Шмат спраў у паходзе бывае ў юных фатографаў, мастакоў, паэтаў.

З кожнага паходу следапыты вяртаюцца ўзбагачаныя новымі ведамі аб гісторыі і сягонняшнім дні роднага краю. Потым рабяты ўсім класам ствараюць альбом паходу.

У гэтым годзе летнія паходы ў нашай школе прысвячаюцца экспедыцыі «Восстановление». Рабяты пазнаёмяцца з гераічнымі працоўнымі подзвігамі землякоў у 1944—1950 гадах, пройдуць па маршрутах дзесятай пяцігодкі.

Шасцікласнікі на чале са сваім класным кіраўніком Л. С. Карнейчык накіроўваюцца ў адну з перадавых гаспадарак раёна — калгас імя Куйбышава, у вёску Узляны пад Рудзенскам. Гэты калгас больш дваццаці год узначальвае Іосіф Антонавіч Гілеўскі. Рабяты сустрэнуцца з ім, а таксама са знатнай свінаркай раёна Героем Сацыялістычнай Працы Соф'яй Купрыянаўнай Наркевіч, з іншымі перадавікамі калгаснай вытворчасці, з вучнямі мясцовай школы.

Летам 1944 года ў баі пад Узлянамі высокі воінскі подзвіг здейсніла батарэя капітана Антона Леанцюка. А піянерскі атрад шасцікласнікаў носіць імя Героя Савецкага Саюза А. К. Леанцюка. Рабяты ідуць на месца подзвігу артылерыстаў. Мы ўпэўнены, што вопытны настаўнік Л. С. Карнейчык і на гэты раз умела правядзе паход.

— Адкуль у Вас такая любоў да паходаў,—спыталі мы аднойчы ў Людмілы Сцяпанаўны.

Яна адказала:

— Паявілася яна ў мяне яшчэ ва універсітэце. Гэтаму ўдзялялася шмат увагі. Вось чаму я з першых год работы ў школе занялася паходамі. У нашай школе таксама клапоцяцца аб летнім адпачынку школьнікаў. Я люблю рабят. Гэта яшчэ адна прычына таго, што мы штогод адпраўляемся ў паходы па роднаму краю.

**В. АРЛОЎ.**
**Заслужаны настаўнік БССР Мар'інагорскай сярэдняй школы № 3 Пухавіцкага раёна.**

## ПРЫЗВАННЕ



...Жалобна гучалі званы. Трапяталася на ветры полымя Вечнага агню. Маўклівыя стаялі каля манумента малійскія філолагі, узрушаныя расказам свайго выкладчыка пра жахлівую трагедыю беларускай вёскі Хатынь — трагедыю, што разыгралася тут больш трыццаці гадоў назад.

Расізм і фашызм — гэта дзве формы адной і той жа ідэалогіі — ідэалогіі эксплуататараў, драпежнікаў, звяроў у чалавечым абліччы. Так думалі малійцы. А іх выкладчыца Тамара Аркадзьеўна Мальцава адчувала, што яе расказ нікога не пакінуў абыякавым. І яшчэ яна думала, што выкладчык павінен таксама быць педагогам-выхавацелем. Не толькі даваць навучэнцам веды, але і выхоўваць іх. Бо вельмі важна, каб гэтыя юнакі, акрамя дыпломаў, прывезлі да сябе на радзіму пачуццё глыбокай павагі і любві да савецкага народа, каб яны адчулі, што і ў рускіх, і ў афрыканцаў аднолькава нялёгкае мінулае.

Педагог... Менавіта гэтае слова найбольш дакладна характарызуе Т. А. Мальцаву, выкладчыцу кафедры французскай і іспанскай моў БДУ імя У. І. Леніна. Сакрэт яе поспеху — выдатнае веданне свайго прадмета, памножанае на не менш глыбокае веданне жыцця, чалавечага характару, псіхалогіі студэнтаў.

Вось чаму амаль пасля кожных заняткаў яна распытвае пра тое, як ідуць справы ў студэнтаў, як здароўе, ці атрымана месца ў інтэрнаце. Гэта дапамагае ўсталяваць добрую, ненацягнутую атмасферу адносін са студэнтамі, наладзіць кантакт з аўдыторыяй.

...Замежныя мовы вабілі Тамару Аркадзьеўну з дзяцінства. У школе вучыла нямецкую, за гады вучобы ў інстытуце авалодала французскай і англійскай. Хацелася ведаць як мага больш. І ўзнагародай за доўгія гадзіны, праведзеныя са слоўнікам і граматыкай у руках, стала магчымасць чытаць у арыгінале Бальзака, Гюго, Мапасана.

— Дарэчы, гэта мае любімыя пісьменнікі, — кажа Тамара Аркадзьеўна. — А яшчэ вельмі люблю Рамэна Ралана.

Чытанне — не адзінае захапленне Тамары Аркадзьеўны. З дзяцінства яна дружыць са спортам. Студэнткай гуляла ў валейбол за каманду інстытута. Яна і цяпер працягвае выступаць на спартыўнай пляцоўцы ў саставе каманды выкладчыкаў. Любіць тэніс, баскетбол. Акрамя таго, мае правы шафёра-аматара.

У сваёй групе (Тамара Аркадзьеўна трэці год з'яўляецца куратарам адной з груп факультэта журналістыкі) яна прачытала курс лекцый па правілах дарожнага руху.

Работа з групай не абмяжоўваецца правядзеннем куратарскіх гадзін і палітінфармацый. Часта арганізоўваюцца экскурсіі, культпаходы, цікавыя паездкі за горад.

Летам мінулага года ў саставе беларускай дэлегацыі Тамара Аркадзьеўна пабывала ў міжнародным лагеры дружбы французскай і савецкай моладзі, які знаходзіцца паблізу Казані. Месяц, праведзены на берагах Волгі, назаўсёды запомніўся шматлікімі сустрэчамі і знаёмствамі з прадстаўнікамі моладзі.

Усім вядома, што прафесія педагога нялёгкая, што яна патрабуе шмат часу, сіл, нерваў. І тым больш прыемна бачыць, што гэтая вялікая праца не прапала дарэмна, а прынесла свае вынікі.

— Таму, хто не працаваў выкладчыкам, — кажа Тамара Аркадзьеўна, — цяжка зразумець, якая гэта вялікая радасць, калі студэнты добра адказваюць па тэме, якую ты растлумачыла мінулы раз. Бачыць паспяховыя вынікі сваёй працы — лепшая ўзнагарода для педагога.

Пры распрацоўцы методыкі выкладання я імкнуся ўлічваць спецыфіку факультэта. Засвоіўшы азы замежнай мовы, студэнты пачынаюць многа працаваць з грамадска-палітычнымі тэкстамі. Чытаем «Маскоўскія навіны», газету французскіх камуністаў «Юманітэ».

У гэтым годзе Тамара Аркадзьеўна выкладае ў малійскіх філолагаў, якія праходзяць стажыроўку ў нашай краіне. «Беларускі універсітэт» расказваў у адным з нумароў пра сустрэчу малійцаў са студэнтамі журфака. Хочацца яшчэ дадаць, што гэтая сустрэча была арганізавана дзякуючы ў першую чаргу Тамары Аркадзьеўне Мальцавай.

І яшчэ адзін штрых да яе партрэта. Гэта сціпласць. У час размовы Тамара Аркадзьеўна падкрэслівала, што ўсе яе поспехі былі б немагчымы, каб не добразычлівая атмасфера, што пануе на кафедры. Яна назвала імёны выкладчыц А. Беленькай, Г. Пільшчыкавай, Т. Святловай, Г. Нікалайчык.

— Гэта не толькі старшыя выкладчыкі, — кажа Тамара Аркадзьеўна,— але і чулыя, уважлівыя старэйшыя таварышы, якія заўсёды дапамогуць справай і парадай. А колькі сіл аддаюць яны падрыхтоўцы традыцыйных вечароў на замежных мовах, штогадовага вечара, прысвечанага памяці Парыжскай Камуны. Пра кожную з іх можна напісаць цэлы артыкул.

...Скончыўся рабочы дзень. Доўгія калідоры запаўняе шэры змрок. У іх нязвыклай цішыні гулка аддаюцца крокі. А заўтра зноў у гэтых калідорах, залітых яркім святлом вясновай раніцы, загучаць галасы студэнтаў. І яна зноў вернецца сюды, зноў адчыніць дзверы знаёмай аўдыторыі і зноў пачне заняткі.

Гэта не прывычка. Гэта прызванне.

**А. КЛАСКОЎСКІ.**

## БІЯХІМІЯ РАСКРЫВАЕ ТАЯМНІЦЫ

Перазвон мянзурак, колб, незлічоных шклянак і шкляначак запаўняў цішыню паміж рэдкімі размовамі, насычанымі прафесійнай тэрміналогіяй. Хімічная лабараторыя пасля некалькіх гадзін лекцый валодала нейкай магічнай сілай прыцягнення, натхняла да пошуку, доследу.

Так было і з першакурснікамі 5-й групы біялагічнага факультэта. Даўно павялося, што студэнтаў з фізічнага факультэта называюць фізікамі, з біялагічнага — біёлагамі. Апошняе датычыцца і нашых знаёмых. Так, ды не зусім. Яны—біяхімікі.

# ЧАМУ Ў КВЕТКІ ПЯЦЬ ПЯЛЁСТКАЎ?

Біяхімія — слова новае. Чалавек, які кіруе нашчаднасцю, — з'ява, якая яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў назад здавалася фантастычнай. Біяхімія — навука аб саставе жывых арганізмаў і хімічных пераўтварэннях, якія ляжаць у аснове жыццёвых працэсаў. Вырашэнне многіх праблем біяхіміі дазволіць радыкальна змяніць развіццё медыцыны, павысіць прадукцыйнасць раслінаводства, жывёлаводства і г. д. Біяхімічныя ферментатыўныя працэсы ляжаць у аснове многіх вытворчасцей лёгкай і харчовай прамысловасці.

Словам, усё гэта з'явілася галоўнай прычынай таго, што год назад наш універсітэт, адна з шасці ВНУ краіны, пачаў падрыхтоўку спецыялістаў па біяхіміі.

...У лабараторыі — засяроджанасць, рабочы настрой. Цяжкія кроплі раствору, падаючы, як метраном, адлічваюць час даследавання. Сінія шарыкі тэасульфіту натрыю слізгацяць па шкляной гарлавіне прылады. Ідзе безупынны аналіз складанейшых унутрымалекулярных працэсаў, нараджаецца ісціна.

Углядваешся ў заклапочаныя твары рабят. Спрабуеш зразумець, што з'яднала іх з навукай, такой жа юнай, як і яны самі. Незвычайнасць, нязведанасць?

Гаворыць Вольга Сычова:

— Вывучаемы аб'ект патрабуе ад мяне ведаў з многіх галін прыродазнаўства. Тут і біялогія, і хімія, і матэматыка... Акрамя таго, прыцягвае пазнанне складанасцей жыцця.

Андрэй Фамічоў:

— Біялогія ў сваім развіцці прарабіла вялікі шлях. З навукі апісальнай яна ператварылася ў навуку глыбока аналітычную. Калі раней біёлагі канстатавалі: гэта кветка белая, таму што ў ле пяць пялёсткаў, то цяпер яны вядуць даследаванне першапрычыны.

...Лабараторныя заняткі наблікаюцца к канцу. У сшытках — чарада формул, запісы, запісы... Сёння студэнты расшыфравалі для сябе нешта новае. Але колькі таямніц іх чакае заўтра!

Два семестры вучобы засталіся ззаду. Мала, многа? Ва ўсякім разе дастаткова, каб хоць крыху зведаць цяжкасці работы, асалоду сваёй творчасці. У рабят, пэўна, ёсць і свае пажаданні тым, хто рыхтуецца адкрыць для сябе ва універсітэце новыя тайны біяхіміі.

— Больш сур'ёзна аднясіцеся да свайго выбару. Ну, а калі адчуваеце, што настаў час выпрабаваць свае сілы і магчымасці, калі ласка. Каму, як не нам, рашаць, чаму ў кветкі пяць пялёсткаў.

**М. ШОЛУХ,**
**асістэнт кафедры біяхіміі.**
**А. КАЗАЧОНАК,**
**студэнт.**



Вучэбная практыка — своеасаблівы працяг сесіі. Студэнты здаюць экзамены на сталасць, выпрабоўваюць сябе ў якасці сапраўдных спецыялістаў.

Студэнты геафака на вучэбнай і вытворчай практыках вывучаюць асаблівасці прыроды, выконваюць заданні па геадэзіі, метэаралогіі і г. д. Амаль усе практыкі праводзяцца на геаграфічнай станцыі «Заходняя Бярэзіна».

## КАНФЕРЭНЦЫЯ Ў СТАРЫХ ДАРОГАХ

**Старадарожскі райком КПБ разам з абласной арганізацыяй таварыства «Веды» і кафедрай марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў БДУ імя У. І. Леніна правялі навуковатэарэтычную канферэнцыю на тэму «XXV з'езд КПСС і фарміраванне новага чалавека».**

**Канферэнцыю адкрыў першы сакратар райкома КПБ А. С. Мурашка. З дакладам «Фарміраванне новага чалавека — адна з галоўных задач будаўніцтва камуністычнага грамадства» выступіў загадчык кафедры філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў БДУ, член-карэспандэнт АН БССР прафесар В. І. Сцяпанаў.**

**Былі заслуханы паведамленні па асобных пытаннях тэмы: «Савецкі спосаб жыцця: сутнасць і асноўныя рысы» (Л. С. Дудзінскі); «Патрыятычнае і інтэрнацыянальнае выхаванне працоўных» (А. Е. Белы); «Фарміраванне духоўных патрэб савецкага чалавека» (Ю. А. Гусеў); «Рацыянальныя адносіны да прыроды — патрэба савецкага чалавека» (Э. В. Клёсава).**

**У заключнай частцы канферэнцыі выступіў першы сакратар РК КПБ. Ён падвёў вынікі і паставіў задачы перад партыйным актывам раёна па выхаванню новага чалавека ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС, XXVIII з'езда КПБ і XVII пленума ЦК КПБ.**

**У канферэнцыі прынялі ўдзел больш як 200 актывістаў раёна.**

**А. БЕЛЫ,**
**удзельнік канферэнцыі.**

## НОВЫЯ ПАСТУПЛЕННІ

**У кабінет сацыяльна-эканамічных і гістарычных навук паступілі наступныя кнігі:**

1. У. І. Ленін, КПСС аб рабоце партыйнага і дзяржаўнага апарату. М., Палітвыдавецтва, 1976.
2. Дзве сусветныя сістэмы: барацьба і спаборніцтва. Прага, «Мір і сацыялізм», 1975.
3. Замежныя марксісты аб рэлігіі і царкве. М., Палітвыдавецтва, 1975.
4. Дайнека В. А. Ленінскі заклік у Камуністычную партыю. (На прыкладзе Кампартыі Беларусі). Мн., «Беларусь», 1975.
5. Праблемы гуманізму ў марксісцка-ленінскай філасофіі. (Гісторыя і сучаснасць). М., Палітвыдавецтва, 1975.
6. Познанскі В. В. Нарыс фарміравання рускай нацыянальнай культуры. Першая палова XIX ст. М., «Мысль», 1975.

# ГРАМАДСКАЕ ДАРУЧЭННЕ—ДОЎГ КОЖНАГА

На ўліку камсамольскай арганізацыі хімічнага факультэта знаходзіцца 811 чалавек. Па выніках завяршальнага этапа Усесаюзнага Ленінскага заліку 69 камсамольцаў не было атэставана. Пры паўторнай пераатэстацыі, праведзенай у канцы красавіка гэтага года, такіх студэнтаў засталося 3. Ім адклалі абмен камсамольскіх дакументаў.

Гэтыя лічбы прывёў у час гутаркі сакратар камсамольскай арганізацыі хімічнага факультэта Аляксандр Скарапанаў. Зразумела, што камсамольскаму важаку не зусім прыемна гаварыць пра такія рэчы. Аднак і не гаварыць пра іх таксама нельга. Насцярожвае той факт, што 50 чалавек не былі з першага разу атэставаны толькі па прычыне акадэмічнай запазычанасці.

Прычын такога становішча многа. І адна з іх — несумленныя адносіны некаторых студэнтаў да выканання камсамольскіх даручэнняў. Можа здацца, што паспяховасць і грамадская работа ніяк не звязаны паміж сабой. Прывяду невялікі прыклад. Група фізхімікаў IV курса (камсорг Валянціна Шэпелева) з'яўляецца лепшай на факультэце. Сярэдні бал паспяховасці тут вышэй чатырох. Пры падвядзенні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва паміж групамі ўлічваецца не толькі паспяховасць, але і грамадская работа. Дык вось, кожны студэнт групы мае якое-небудзь камсамольскае даручэнне. І, як мы бачым, гэта ніколькі не перашкаджае вучобе. Наадварот, прывучае да адказнасці за даручаную справу, да самадысцыпліны. Безумоўна, было б няправільна сцвярджаць, што ўсе камсамольцы групы аднолькава адносяцца да выканання грамадскіх нагрузак. Адны з іх удзяляюць даручэнням больш часу, другія — менш. Справа не ў гэтым. Галоўнае тое, што актыў групы не праходзіць міма нават самага невялікага праяўлення безадказнасці ў грамадскай рабоце, пастаянна кантралюе яе выкананне. Метады ж, якімі кіруюцца рабяты, самыя розныя. Гэта і правядзенне сходаў, дзе кожны камсамолец паведамляе аб выкананай рабоце, і абмен вопытам, і спецыяльныя заняткі.

А вось прыклады няўмелай арганізацыі свайго часу, недастатковага спалучэння асабістых і грамадскіх інтарэсаў.

На факультэце існуе фотагрупа нагляднай агітацыі. У яе састаў уваходзяць пяць мастакоў і пяць фатографаў. На пасяджэнні групы было запланавана выпускаць не менш дзвюх фотагазет у месяц. Аднак доўгі час газета не выпускалася. Група кантролю за выкананнем камсамольскіх даручэнняў, старшынёй якой з'яўляецца студэнт I курса Анатоль Грынчанка, была вымушана правесці спецыяльную праверку. Аказалася, што фатографы недастаткова сур'ёзна аднесліся да даручанай справы. Гэта і прывяло да зрыву выпуск фотагазеты. Як ні дзіўна, тлумачылі яны гэты факт вялікай занятасцю вучобай.

Заслугоўвае пільнай ўвагі і работа «Камсамольскага пражэктара», які ўзначальвае студэнт IV курса Анатоль Кісель. Праўда, у апошні час работа тут палепшылася. Хочацца верыць, што гэта не выпадковая з'ява, што рабяты, нарэшце, зразумелі ўсю важнасць даручанай ім справы.

Пакідае жадаць лепшага і работа студсавета хімфака (старшыня Г. Баран). У яго састаў былі ўведзены чатыры студэнты, кандыдатуры якіх не абмяркоўваліся на агульным сходзе.

Насценная газета — орган студсавета інтэрната — пераўтварылася па-сутнасці ў каляндарны лісток. Вісіць яна на дзесятым паверсе, у той час як асноўная колькасць студэнтаў факультэта жыве на восьмым і дзевятым паверхах.

Аб усім гэтым не раз паведамляла насценная газета факультэта «Хімік» (рэдактар — старшы выкладчык кафедры будовы рэчыва Аляксандр Мікалаевіч Рабцаў). Нагогул рэдкалегія газеты робіць нямала, каб больш поўна выявіць і ліквідаваць тыя недахопы, якія маюць месца на факультэце. Нядаўна, адзначаючы заслугі газеты, загадам па факультэту шэраг студэнтаў, якія супрацоўнічаюць у «Хіміку», былі ўзнагароджаны граматамі дэканата. Многім была аб'яўлена падзяка.

Як бачна, адносіны камсамольцаў да сваіх даручэнняў самыя розныя.

У разгары летняя экзаменацыйная сесія. Яна з'явіцца адным з галоўных выпрабаванняў і ацэнак камсамольскай работы на хімічным факультэце.

**Л. БАГАРОДАВА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**



## У В А Г А

**ПРАДСТАЎЛЯЕМ УДЗЕЛЬНІКАЎ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ ВЫКЛАДЧЫКАЎ І СУПРАЦОЎНІКАЎ УНІВЕРСІТЭТА.**

# У ПОШУКАХ СВАЁЙ НОТЫ

Чатыры гады назад прыйшоў кіраваць харавой капэлай журфака студэнт тады яшчэ I курса кансерваторыі з аддзялення дырыжыравання Васіль Яловік. Гэта і было пачаткам дружбы паміж студэнтамі журфака і кансерваторыі. Моцным падмуркам гэтай дружбы з'явілася арганізацыя хору на факультэце. Новая справа заўсёды даецца цяжкавата, узнікае шмат перашкод. Але ўсё пераадольвала настойлівасць, адданасць справе, упартасць у дасягненні пастаўленай мэты кіраўніка хору. Васіль, сам бязмежна ўлюбёны ў музыку, змог перадаць часцінку гэтай улюбёнасці і сваім харыстам.

За чатыры гады ўтварылася моцнае творчае ядро капэлы. Гэта чацвёртакурснікі Таццяна Леанкова і Уладзімір Дашкевіч, Аляксандр Астроўскі і Іна Уладзімірава. Вакол гэтага ядра сабраліся студэнты першага курса.

Пачалася напружаная, складаная, паглынаючая ўвесь вольны час работа. Кіраўнік хору — студэнт, у яго таксама лекцыі, заняткі, напружаныя сесіі. Да таго ж мае грамадскае даручэнне — старшыня студсавета інтэрната. Яго энергіі можна па-добраму пазайздросціць.

Кожная рэпетыцыя для нас і нашага кіраўніка — гэта напружаная, плённая работа, гэта нашы радасці і засмучэнні. У кожнага кіраўніка — свой стыль работы. У Васіля ён своеасаблівы: яркі і пераканаўчы. Пакуль стомленыя сапрана, басы, альты і тэнары адпачываюць, Васіль робіць цікавы і захапляючы экскурс у гісторыю савецкай і замежнай музыкі, расказвае пра жыццё вядомых кампазітараў, знаёміць з гісторыяй нараджэння песні. Гэтыя кароценькія «лекцыі» па музыказнаўству кіраўнік цесна ўвязвае з нашымі заняткамі. І ад гэтага рэпетыцыі становяцца не толькі творчым і напружаным рабочым месцам харавой капэлы. Яны становяцца месцам пасвячэння ў музыку і практычна, і тэарэтычна.

Неабходнасцю стала хадзіць на рэпетыцыі, вывучаць сальфеджыо і потым пець. І не проста пець, а па 5—6 разоў адну і тую ж музычную фразу. Цяжка? Так! Іншы раз здавалася, што нічога і не атрымаецца, прыходзіла здрадніцкая думка кінуць усё, маўляў, не хапае здольнасцей. Марудна, але ўпэўнена, крок за крокам прыходзіць калектыў да чыстага гучання, да правільнай пастаноўкі дыхання, да вернай інтанацыі, эмацыянальнай афарбоўкі і, нарэшце, уласнага задавальнення. Паявіліся першыя поспехі, складаней стаў рэпертуар, павысіліся патрабаванні да кожнага.

«Наш Вася» — называюць свайго кіраўніка харысты. І гэта не прыгожыя словы, а ўзаемапавага, наша аднадумства, агульная мэта, наша дружба. Розныя творы выконвае харавая капэла. Класіка («Аве Марня») і задорная беларуская «Кацілася чорна галка», задуменная, са светлым сумам на словы С. Ясеніна «Ты запой мне ту песню» і жартоўная «Там, каля млына» —такі далёка не поўны рэпертуар харавой капэлы.

Калектыў шукае сябе, шукае свой шлях да высокага мастацтва, шукае сваю ноту гучання, свой «голас». І як вынік — прыходзіць шчырая, глыбокая любоў да музыкі.

**Т. ВОЛКАВА.**



**НА ЗДЫМКАХ:**

Супрацоўнікі філалагічнага факультэта выконваюць літаратурную кампазіцыю.

Шчыра гучыць у выкананні Р. Гілевіч, выкладчыцы геафака, старадаўні рускі раманс «Раніца туманная».

Выступае дуэт супрацоўнікаў філфака.

Фота А. ЦЫГУЛЁВА.



## НА КАФЕДРАХ І Ў ЛАБАРАТОРЫЯХ

# 10 ГОД ПЛЁННАЙ ПРАЦЫ

Сення наша размова аб адной з самых маладых кафедр геаграфічнага факультэта. У гэтым годзе кафедра агульнага землязнаўства, якой кіруе доктар геаграфічных навук, прафесар Вольга Піліпаўна Якушка, святкуе сваё дзесяцігоддзе.

Кожны год, першага сакавіка, чытае Вольга Піліпаўна для студэнтаў лекцыі і потым, за ўвесь час навучання на факультэце, будучым географам прыходзіцца сутыкацца з праблемамі, якія рашае кафедра.

— Гаворачы «наша кафедра», мы маем на ўвазе галіновую навукова-даследчую лабараторыю лімналогіі, бо ўсе праблемы, якімі займаюцца супрацоўнікі і студэнты, так або інакш датычацца возеразнаўства,— расказвае Вольга Піліпаўна.— Калектыў у нас — самы малады на факультэце, 26 гадоў — сярэдні ўзрост яго супрацоўнікаў.

Дзесяць гадоў назад пры кафедры фізічнай геаграфіі замежных краін была створана лімналагічная група, у састаў якой увайшлі В. П. Якушка, І. А. Мыслівец і А. К. Мельнікаў. Тэматыка даследаванняў — асаблівасці азёрных вадаёмаў Беларусі. Сёння гэта ўжо вялікая лабараторыя, якая налічвае 32 супрацоўнікі. Кіруе лабараторыяй старшы выкладчык Валерый Антонавіч Калечыц. Нядаўнія выпускнікі факультэта Зіна Шаблінская, Барыс Уласаў, Сяргей Смірноў працуюць побач са сваімі настаўнікамі. Яны не толькі выдатныя спецыялісты, але і энтузіясты, улюбёныя ў сваю справу.

На ўсю краіну славіцца мінералагічны музей, створаны пры лабараторыі, адзіны ў нашай рэспубліцы. Наладжаны цесныя сувязі з навукова-даследчымі інстытутамі Масквы, Ленінграда, Прыбалтыкі. Вялікі комплекс даследчых работ праводзіць калектыў лабараторыі, і ў асноўным уся работа вядзецца ў палявых умовах.

— Кожнае лета ў час зімовых студэнцкіх канікул супрацоўнікі разам са старшакурснікамі адпраўляюцца ў навуковую экспедыцыю,— расказвае загадчыца сектара біягеахіміі Ірына Аляксандраўна Мыслівец.

— Па заданню Міністэрства меліярацыі і воднай гаспадаркі БССР, а таксама Беларускага навукова-даследчага інстытута рыбнай гаспадаркі ў апошні час мы займаемся вывучэннем хімічнага саставу вады, характару грунту, асаблівасцей жывёльнага і расліннага свету паўночна-заходніх азёр нашай рэспублікі.

Некаторыя лічаць, што экспедыцыя — тая ж паездка на дачу: купайся сабе, загарай. Але той, хто хоць раз пабываў у ёй, добра разумее, што гэта зусім не так. Колькі ўпартасці, вынослівасці, ведаў, колькі сілы, звычайнай мужчынскай сілы патрэбна для таго, каб нарэшце знайсці адказ на пастаўленае пытанне. Колькі патрэбна смеласці, каб рабіць доўгія пераходы па замёрзшаму возеру, а колькі аптымізму, каб у небяспечныя хвіліны напомніць сябрам жартаўлівы дэвіз: «Сам — тані, а прылады — выратуй». А ці ведаеце вы, якое самае глыбокае возера на тэрыторыі нашай рэспублікі? Гэта возера Доўгае, што ў Глыбоцкім раёне, яго глыбіня дасягае 53 метраў. Дарэчы, гэта адкрыццё зрабіла Ірына Аляксандраўна Мыслівец. Яна ж склала «пашпарт» гэтага возера. Усяго супрацоўнікамі лабараторыі складзена 225 такіх пашпартоў. Ёсць у гэтым і доля студэнцкай працы. Нездарма ж яны едуць у экспедыцыю з пэўным багажом ведаў, якім запасаюцца на лекцыях Вольгі Піліпаўны. Спецкурс па возеразнаўству — гэта яе ініцыятыва. Таварышы па рабоце падтрымалі добрае пачынанне — яны праводзяць са студэнтамі практычныя заняткі і кіруюць студэнцкім навуковым гуртком, які займаецца выключна праблемамі беларускіх вадасховішчаў.

— Ахоўваць водныя рэсурсы краіны — гэта не значыць агарадзіць азёры і нікога не падпускаць да іх,— жартуе Вольга Піліпаўна.— Гэта значыць навучыцца рацыянальна выкарыстоўваць іх багацце, захоўваючы ў той жа час непаўторную прыгажосць і жывапіснасць. І тут патрэбен навуковы падыход да справы,— ужо сур'ёзна дадае яна.

Усю работу, якую праводзіць кафедра, з упэўненасцю можна назваць навуковай. Але, акрамя штодзённай справы, кожны супрацоўнік мае сваю асабістую тэму, якой ён займаецца ў свабодныя хвіліны. Калектыў лабараторыі працуе над другой рэдакцыяй хрэстаматыі па геаграфіі БССР для сярэдніх школ. Рыхтуецца да абароны кандыдацкай дысертацыі Ірына Аляксандраўна Мыслівец. Яе тэма: «Прыродныя рэсурсы Браслаўскіх азёр».

Лабараторыя жыве сваімі штодзённымі клопатамі. Пачалася падрыхтоўка да летняй экспедыцыі, набліжаецца абарона дыпломных работ. Дарэчы сказаць, што за два апошнія гады на кафедры было абаронена 25 дыпломных работ і большая іх частка — на «выдатна». Ёсць і яшчэ адно прыемнае паведамленне — група супрацоўнікаў лабараторыі на чале з Вольгай Піліпаўнай Якушка рыхтуецца прыняць удзел у II Сусветным сімпозіуме па гісторыі азёр, што адбудзецца ў Польшчы.

**Калі каго з вас зацікавіла работа лабараторыі, навуковыя даследаванні і экспедыцыі яе супрацоўнікаў, абавязкова прачытайце кнігу Вольгі Піліпаўны Якушкі «Край блакітных азёр». Гэта серыя навукова-папулярных нарысаў аб прыродзе азёрных вадаёмаў, аб багацці і непаўторнасці азёрнага краю, аб складанай і пачэснай працы гэтых цікавых людзей.**

**Т. ЛІШАЙ,**
**студэнтка II курса журфака.**

